**Мікалаева Л.В.**

# ЗАКАНАДАЎЧЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА У КАНЦЫ XIV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.

Пры даследаванні праблем знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) канца XIV – сярэдзіне XVI ст. маецца магчымасць абаперціся на шырокае кола заканадаўчых дакументаў. У разглядаемы перыяд юрыдычная аснова знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ нйперш была акрэслена ў агульназемскіх прывілеях, а таксама ў Статутах ВКЛ (для нашага перыяду можна апеляваць толькі да першых двух, 1529 і 1566 гг.).

Ужо ў прывілеі ад 20 лютага 1387 г. знаходзім словы, якія датычылі арганізацыі і фінансавай падтрымкі ваенных мерапрыемстваў знешнепалітычнага характару: «…У паходзе ж, пакуль ён будзе працягвацца, згодна са старажытным звычаем пераход абавязаны рабіць за свой кошт і сродкі. Калі будзе патрэба праследаваць якіх бы там ні было ворагаў, непрыяцеляў і самой зямлі нашай Літоўскай уцекачоў, то для праследавання такім спосабам, які паводле звычая завецца «пагоняй», абавязаны выступіць не толькі людзі, хто носіць зброю, але кожны мужчына, у якіх бы абставінах ці становішчы ён ні знаходзіўся, толькі б мог насіць ваенную зброю…» [1, с. 102; 2, с. 427; 6, s. 66–67; 7, s. 2]. Такім чынам, азначаныя пункты прывілея, па-першае, ускладалі абавязкі па ўтрыманні ваяроў у паходзе на саміх рыцараў, па-другое, абазначалі, у выпадку вострай небяспекі і неабходнасці, ваеннаабавязанасць усяго дарослага мужчынскага насельніцтва краіны, здольнага насіць зброю. Апошняе, несумненна, было накіравана на павышэнне абароназдольнасці краіны.

Змест Гарадзельскага прывілея ад 2 кастрычніка 1413 г. (першы з трох актаў у дакументах Гарадзельскай уніі 1413 г.) меў непасрэдныя адносіны да знешняй палітыкі ВКЛ [1, с. 115–118; 3, с. 211–216]. Па-першае, ім пацвярджалася унія ВКЛ з Польшчай, якая з 1385 г. стала традыцыйнай формай узаемаадносін паміж дзяржавамі. Па-другое, артыкул 1 прывілея называў асноўнай прычынай яго падпісання знешнюю небяспеку з боку крыжакоў [1, с. 115; 3, с. 211]. Тэкст прывілея ўтрымліваў шэраг супярэчлівых формул, якія выклікалі гарачую палеміку і нарадзілі багатую гістарыяграфію па праблеме характару ўзаемаадносін паміж ВКЛ і Польшчай да і пасля падпісання Гарадзельскай уніі 1413 г. Задзелам на будучыню станавіўся артыкул 14 правілея, які прадугледжваў магчымасць правядзення агульных соймаў прадстаўнікоў палітычнай эліты Польшчы і ВКЛ для вырашэння сумесных спраў «… у Любліне або ў Парчове, або ў іншых адпаведных месцах, згодна з нашай воляй…» [1, с. 118; 3, с. 216]. Аднак у ВКЛ уплыў соймаў на сферу кіраўніцтва знешняй палітыкай стане заўважальным толькі ў XVI ст. [4, с. 36–38].

Агульназемскі прывілей, выдадзены 6 мая 1434 г. [1, с. 119–121; 3, с. 216–217], утрымліваў у сваім тэксце невялікі фрагмант, які меў дачыненне

да арганізацыі вонкавай бяспекі гаспадарства. Даючы значныя правы і ільготы праваслаўным феадалам, артыкул 6 прывілея 1434 г. захоўваў за імі павіннасць пабудовы і рамонту замкаў і ваенных шляхоў: «… аднак, на названых князях і баярах і іх падданых захоўваем, пры нас і пры нашых наследніках, пабудову і рэпарацыю тых замкаў і ваенных шляхоў, да якіх яны прымацоўваліся з старыны, на іх уласныя выдаткі, без чаго не могуць быць у добрым стане нашы землі...» [1, с. 120–121; 3, с. 216–217]. Апошняе тлумачэнне падкрэслівала менавіта заклапочанасць вярхоўнай улады знешняй бяспекай дзяржавы.

Наступны агульназемскі прывілей быў падпісаны 2 мая 1447 г. [1, с. 124–127; 2, с. 427–428; 3, с. 218–220]. Адной з яго мэтаў было падкрэсленне і ўмацаванне суверэнітэту ВКЛ у рамках асабістай уніі з Польшчай. Так, у артыкуле 13 сцвярджалася: «Також обецуем и слюбуем, иж панства нашего земль, великого князьства предреченого, не вменшим, але у границах, как же предки были наши, на имя князь Александр, нареченый Витовт, дядя наш, и иные держали и володели, також и мы тыеж земли здорови, целы, держати будем, и володети и щитити, а с божьею помочью и всими силами размножати будем» [1, с. 127; 2, с. 428; 3, с. 220]. Такім чынам, з гэтага моманту кіраўніцтва ВКЛ юрыдычна не магло саступаць хаця б частку тэрыторыі дзяржавы. Артыкул 14 утрымліваў абяцанне манарха не прызначаць іншаземцаў на пасады ў ВКЛ і не даваць ім тут маёнткі [1, с. 127; 2, с. 428; 3, с. 220]. Змест параграфа, у першую чаргу, быў скіраваны супраць пранікнення польскай шляхты у ВКЛ. Пэўнае дачыненне да сферы знешняй палітыкі меў і артыкул 5 прывілея, які дазваляў, «…абы княжата, рытеры, шляхтичи, бояре, добровольно имели бы моць выехати з нашых земель князьства великого, для лепшого шчастья набытия, а любо учинков рытерских, до каждых земль, сторон, только выменяючи стороны неприятельское» [1, с. 125; 2, с. 428; 3, с. 219]. Адным з найважнейшых быў артыкул 10 прывілея, у якім змяшчаліся палажэнні аб вызваленні сялян з маёнткаў, належачых князям, рыцарам, шляхце, баярам і мяшчанам, ад дзяржаўных натуральных і грашовых павіннасцей, пакідаючы на карысць гаспадара толькі стацыі, а таксама павіннасць будаваць і рамантаваць дарогі і замкі [1, с. 126; 2, с. 428; 3, с. 219]. Дадзеныя палажэнні мелі непрадказальныя наступствы для сферы знешняй палітыкі, бо прывялі да значнага скарачэння паступленняў у скарб дзяржавы. Хранічная пустэча ў ім прымушала вялікіх князёў літоўскіх звяртацца за дазволам на разнастайныя субсідыі да землеўладальнікаў, што стала адной з перадумоў росту палітычнага значэння шляхты ВКЛ і яе ўмяшання ў сферу кіравання знешняй палітыкай дзяржавы.

Агульназемскі прывілей ад 6 жніўня 1492 г. нарматыўна абмежаваў уладу вялікага князя з боку паноў Рады [2, с. 430–435; 3, с. 220–225]. У артыкулах 12 і 13 прывілея знайшлі адлюстраванне гарантыя самастойнасці і дзяржаўнай асобнасці ВКЛ, акцэнт на незалежнасці ў знешняй палітыцы [2, с. 431, 434; 3, с. 223]. Артыкул 13 санкцыянаваў узаемную кампетэнцыю вялікага князя і паноў Рады ў кіраванні знешняй палітыкай і пералічваў

асноўных дыпламатычных партнёраў ВКЛ. Згодна з артыкулам 23 прывілея, паны Рады атрымалі права кантролю за выкарыстаннем сродкаў дзяржаўнага скарбу [2, с. 432, 435; 3, с. 224], а тым самым і за фінансаваннем арганізацыі і ажыццяўлення знешнепалітычных акцый.

Важнейшай знешнепалітычнай мэтай, замацаванай артыкулам 12 прывілея, было захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. Гаспадар абавязваўся не памяншаць тэрыторыю дзяржавы, а наадварот яе павялічваць [2, с. 431, 434; 3, с. 223]. Гэта палажэнне, паўтараўшае артыкул 13 прывілея 1447 г., стала пастаяннай часткай усіх наступных прывілеяў і было адлюстравана ў артыкуле 2 Раздзела III Статута ВКЛ 1529 г. [5, с. 48; 2, с. 441] і артыкуле 3 Раздзела III Статута ВКЛ 1566 г. [2, с. 491]. У сваю чаргу артыкул 16 прывілея 1492 г. услед за артыкулам 14 прывілея 1447 г. паўтараў забарону раздаваць іншаземцам пасады і маёнткі ў ВКЛ [2, с. 431, 434; 3, с. 223], таксама як артыкул 3 Раздзела III Статута ВКЛ 1529 г. [5, с. 48; 2, с. 441] і артыкул 3 Раздзела III Статута ВКЛ 1566 г. [2, с. 491].

У агульназемскім прывілеі ад 7 снежня 1506 г. і Статутах ВКЛ 1529 г. і 1566 г. пытанні аб зносінах з іншымі дзяржавамі і праблемы знешняй палітыкі прама амаль не закраналіся. Артыкул 4 прывілея 1506 г. ужо традыцыйна абяцаў, што ў выпадку зяняцця Жыгімонтам Казіміравічам трона ў Польшчы, ён «…з таго часу нашу дамінію вялікага княства Літоўскага і добры паноў-рады ні ў чым не паменшым, але цалкам захаваем ад усякага парушэння законаў, беспадстаўнасці і абцяжарвання, як зрабіў наш бацька ў час свайго шчаслівага царавання» [3, с. 228]. У прывілеі ад 7 снежня 1506 г. і Статутах ВКЛ 1529 г. і 1566 г. знайшоў далейшае заканадаўчае замацаванне прынцып саўдзелу Рады паноў у кіраванні важнейшымі сферамі жыцця дзяржавы [3, с. 227–229; 5, с. 40–41; 2, с. 441, 490–491]. Артыкул 6 раздзела I Статута ВКЛ 1529 г. замацаваў заканадаўчую абарону годнасці і гарантыю бяспекі дыпламатычных агентаў. Парушэнне яго пагражала смяротным пакараннем і прыраўнівалася да абразы самога гаспадара [5, с. 34; 2, с. 436].

У Статуце ВКЛ 1566 г. у цэлым знайшла адбіццё змена знешнепалітычнага становішча ВКЛ у сувязі з пачаткам Лівонскай (Інфлянцкай) вайны 1558–1582 гг. Надзвычай значную рэгламентацыю атрымаў Раздзел II «Аб абароне земскай», робячы акцэнт не толькі на яе арганізацыі, але і на санкцыях за парушэнне шляхтай свайго ваеннага абавязку [2, с. 486–490]. Тое ж можна сказаць пра артыкулы Раздзела I «Аб персоне гаспадарскай», якія падрабязна асвятлялі моманты, якія ўспрымаліся ў якасці дзяржаўнай здрады, а не толькі абразы манарха [2, с. 481–483].

Заканадаўчае афармленне набыла і практыка афіцыйнай забароны паставак тавараў ваеннага прызначэння ў непрыяцельскія краіны. Адпаведны артыкул 41 «О невывоженью приправ военных до земли неприятельское» быў уведзены ў Раздзел III «О вольностях шляхецких и о розмноженью Великого Князства Литовского» Статута ВКЛ 1566 г. Артыкул сведчыў: «Уставуем и вечными то часы мети хочем, постерегаючи того, абы зов сих

земль панства нашого Великого Князства Литовского яко жидове татарове купцы и вси подданые наши, которого кольвек стану, явне и таемне всяких броней железа ручниц, нажов стрел и всякого иншого наряду военного не выпущали и вывозили, послом не продавали, с чого бы неприятель силитись мог. А хто бы се того смел важыти над тое росказанье и уставу нашу, тот ничим иным одно горлом каран быти маеть, а товари и вся маетность его маеть быти до скарбу нашого взята, а того с пильностью на всех замкох украинных сторожове и вси врядники наши постерегати мають, а то се розумети будеть в покою и под не впокоем» [2, с. 497]. Звяртае на сябе ўвагу жорсткасць пакарання за парушэнне гэтай забароны – страта жыцця, а таксама тое, што гэта правіла дзейнічала не толькі ў ваенны, але і мірны час.

Такім чынам, заканадаўчыя крыніцы, бясспрэчна, маюць важнае значанне для вывучэння розных аспектаў знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст., у тым ліку асноўных прынцыпаў і мэтаў ажыццяўлення і кіравання гэтай сферай. Апошняе было сведчаннем усведамлення іх важнасці для ўсёй сферы кіравання дзяржавай і ўзросшай прававой культуры тагачаснага грамадства.

*Крыніцы і літаратура*


1. Белоруссия в эпоху феодализма : сборник документов и материалов : [в 4 т.] / Академия наук БССР, Институт истории, Архивное управление МВД БССР. – Минск : Изд-во АН БССР, 1959. – Т. 1 : С древнейших времен до середины XVII века / [составители : З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога]. – 515 [1] с. : табл.

2. Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 2010. – Т. 3. Дадатак. А – Я / рэдкал. : Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. З. Э. Герасімовіч. – 696 с. : іл.

3. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах : У 4 т. – Менск : Выд. АН БССР, 1936. – Т.1 : IX–XVII ст. (/ Скл. : акад. В. К. Шчарбакоў, дац. К. І. Кернажыцкі і вуч. археограф Д. І. Даўгяла). – XVI, 678 с.

4. Мікалаева, Л. В. Арганізацыя знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Л. В. Мікалаева. – Мінск, 2003. – 108 с.

5. Статут Великого княжества Литовского 1529 г. : Текст, перевод, словарь-комментарий / Под ред. акад. К. И. Яблонскиса. – Минск : Изд-во АН БССР, 1960. – 253 с.

6. Akta unji Polski z Litwą. 1385–1791 / wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. – Kraków : Skład główny w księgarni Gebethnera i Wolffa, 1932. – 633 s.

7. Zbior praw litewskich od roku 1389 do roku 1529, tudzież Rozprawy sejmowe o tychże prawach od roku 1544 do roku 1563 / [wydał i przedmową opatrzył A. T. Działyński]. – Poznań : w Drukarni na Garbarach, 1841. – 542, IV s.